Педагагічная праца — гэта арганізацыя сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў з выкарыстаннем матэрыяльных і духоўных сродкаў. У працэсе вучобы, практыкі і пастаяннага павышэння кваліфікацыі настаўнік стварае сваю педагагічную сістэму, якая дазваляе яму паспяхова дасягаць пастаўленых задач. Прычым педагагічная сістэма — гэта не проста сукупнасць асобных элементаў, а найперш дакладна ўсталяваныя сувязі і адносіны паміж імі.

# Падмуркі сістэмы работы

## Тэхналагічны падыход да арганізацыі педагагічнай дзейнасці



**Уладзімір Лявонцьевіч Малашэвіч,**
настаўнік фізікі і матэматыкі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Даўгінаўская сярэдняя школа імя У. І. Слабодчыкава» Вілейскага раёна. Педагагічны стаж — 40 гадоў.

Што неабходна для стварэння сістэмы дзейнасці? Перш за ўсё знайсці аптымальную сукупнасць элементаў. Іх павінна быць толькі неабходная для функцыянавання колькасць.

Другі этап фарміравання сістэмы — вызначэнне функцый, якія выконвае той або іншы элемент. Трэці этап у распрацоўцы сістэмы звязаны з выбарам абгрунтаваных форм і метадаў узаемасувязі і ўзаемадзеяння элементаў. Кожны элемент у сістэме разглядаецца з улікам не толькі яго функцый, але і ролі ўнутры адзінага цэлага. Нарэшце, заключны этап у фарміраванні сістэмы заключаецца ў тым, каб сродкамі канкрэтных форм работы развіць кожны элемент сістэмы да ўзроўню ўзаемадзеяння з іншымі.

Агульная структура сістэмы работы, якая апрабоўвалася пры выкладанні фізікі ў школе, уключала наступныя асноўныя элементы-блокі:

- мэту і задачы, якія вызначаюць дзейнасць сістэмы, а таксама змест дзейнасці (далей — сацыяльны заказ);
- вучняў, на якіх скіравана сістэма (далей — калектыў вучняў);
- набор метадаў і прыёмаў навучання, якімі валодае настаўнік і якія можна выкарыстоўваць у дадзеных умовах школы (далей — методыка выкладання);
- педагога, закліканага на практыцы ажыццяўляць пастаўленыя мэты і задачы дзейнасці, канкрэтызаваць яе змест і арганізацыю (далей — настаўнік);
- матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне працэсу навучання і ўмовы працы (далей — кабінет);
- арганізацыю і кіраванне навучаннем і выхаваннем вучняў (далей — працэс навучання).

Блок-схема такой педагагічнай сістэмы адлюстравана на малюнку.

Кожны з блокаў мае сваю складаную структуру. Таму лагічна, каб педагагічная сістэма, па якой працуе настаўнік, адлюстроўвалася па файлавым прынцыпе (у камп'ютарным варыянце). Без строгага ўпарадкавання ёсць рызыка ўзнікнення хаосу,

**читайте в свежем номере «ОМ»**